ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
27
ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 7 (1493)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ
ТЭЛЕТАЙП
«ВЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

АДКРЫЦЦЮ XXVII З'ЕЗДА КПСС

прысвячаюцца палітінфармацыі, якія праходзяць у акадэмічных групах. Студэнты, члены лектарскай групы БДУ праводзяць палітінфармацыі ў падшэфных школах і ГПТВ аб рабоце з'езда.

А. ГУТАВЕЦ.

СЁННЯ

народны ансамбль танца «Крыжачок» запрашае ўсіх на рапарт-канцэрт, прысвечаны XXVII з'езду КПСС.

М. ТАРАСАВА.

«ПАРТЫЯ — РОЗУМ, ГОНАР І СУМЛЕННЕ

нашай эпохі»— пад такім дэвізам фундаментальная бібліятэка БДУ імя У. І. Леніна сумесна з кафедрай гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў праводзіць адкрыты прагляд літаратуры.

Экспазіцыю складае звыш 300 кніг па гісторыі партыі.

Ф. МІРУШЧАНКА.

АФГАНСКІЯ СТУДЭНТЫ І АСПІРАНТЫ

правялі мітынг, прысвечаны Дню Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Адкрыў мітынг старшыня зямляцтва афганскіх студэнтаў Насім Сагар. Ён паведаміў аб становішчы на радзіме, аб поспехах маладой рэспублікі ў будаўніцтве новага жыцця, аб дапамозе Савецкага Саюза іх краіне. Пасля да помніка савецкім воінам былі ўскладзены вянкі і іх памяць была ўшанавана мінутай маўчання.

Н. КАЗЭМ,
М. НАДЭР.

У ГОСЦІ

да студэнтаў факультэта журналістыкі напярэдадні свята Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту прыходзілі ваенныя журналісты — начальнік аддзела газеты «Во славу Родины» падпалкоўнік М. С. Карака і карэспандэнт аддзела маёр А. П. Ярашэнка.

Студэнтам было цікава даведацца пра спецыфіку работы ваенных журналістаў, пра тэматыку іх газетных выступленняў. Маёр А. П. Ярашэнка расказаў пра сваю журналісцкую працу ў дывізіённай газеце ў час службы ў Афганістане.

Сустрэчы з журналістамі-практыкамі сталі добрай традыцыяй на журфаку. Яны даюць магчымасць студэнтам не толькі атрымоўваць цікавую інфармацыю аб сваёй будучай прафесіі. Гэта яшчэ і добрая школа пазнання сакрэтаў журналістыкі.

Н. ПАХОМАВА.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб ходзе XXVII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

25 лютага 1986 года, у 10 гадзін раніцы, у Маскве, у Крамлёўскім Палацы з'ездаў у дзелавой абстаноўцы адкрыўся XXVII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Прысутныя ў зале апладысментамі вітаюць членаў Палітбюро ЦК КПСС таварышаў Гарбачова М. С., Аліева Г. А., Варатнікова В. І., Грамыку А. А., Кунаева Д. А., Лігачова Я. К., Рыжкова М. І., Саломенцава М. С., Чэбрыкава В. М., Шэварднадзе Э. А., Шчарбіцкага У. В.

З'езд адкрывае цёпла сустрэты дэлегатамі і гасцямі Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў.

Дэлегаты аднагалосна выбіраюць кіруючыя органы з'езда — Прэзідыум, Сакратарыят, Рэдакцыйную і Мандатную камісіі.

Старшынствуючы — член Палітбюро, сакратар ЦК КПСС Я. К. Лігачоў паведамляе, што па запрашэнню Цэнтральнага Камітэта КПСС на з'езд прыбылі дэлегацыі зарубежных камуністычных, рабочых, рэвалюцыйна-дэмакратычных, сацыялістычных, сацыял-дэмакратычных, лейбарысцкіх і іншых партый, прадстаўнікі дэмакратычных грамадскіх арганізацый. Удзельнікі з'езда сардэчна вітаюць гасцей.

Зацвярджаецца наступны парадак дня XXVII з'езда КПСС:

Справаздача Цэнтральнага Камітэта КПСС і задачы партыі.

Аб новай рэдакцыі Праграмы КПСС.

Аб змяненнях у Статуце КПСС.

Палітычны даклад Цэнтральнага Камітэта КПСС XXVII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза — дакладчык Генеральны сакратар ЦК КПСС тав. Гарбачоў М. С.

Справаздача Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС — дакладчык старшыня Цэнтральнай рэвізійнай камісіі тав. Сізоў Г. Ф.

Аб Асноўных напрамках эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986 — 1990 гады і на перспектыву да 2000 года — дакладчык Старшыня Савета Міністраў СССР тав. Рыжкоў М. І.

Выбары цэнтральных органаў партыі.

Прымаецца прапанова асобных дакладаў па першых трох пытаннях не рабіць, а іх сутнасць выкласці ў Палітычным дакладзе Цэнтральнага Камітэта КПСС XXVII з'езду партыі.

З Палітычным дакладам Цэнтральнага Камітэта КПСС XXVII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Гарбачоў Міхаіл Сяргеевіч. Даклад быў выслухан з вялікай увагай і неаднаразова суправаджаўся працяглымі апладысментамі.

З'езд працягвае работу.

ПЕРАМОЖЦЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА Ў ГОНАР XXVII З'ЕЗДА КПСС

Б. В. Стральцоў: «НЕ СТАМЛЯЙЦЕСЯ, МАЛАДЫЯ!»

АДНОЙЧЫ студэнты журфака засумавалі: адны збіраліся ісці ў кіно, іншыя, наперакор ім, канспектавалі нешта на тры курсы наперад. І тут у аўдыторыю зайшоў ён. (Гэты сказ нагадвае нешта казачнае, але і студэнтам яшчэ хочацца незвычайнага). Ветліва ўсміхнуўся, пачаў — не, не лекцыю, пачаў размову з намі. Памятаю: усе — і тыя, хто гультайнічаў, і тыя, хто «рыпеў пер'ямі»,— устрапянуліся. нібыта свежае сакавіцкае паветра запоўніла аўдыторыю. А ён — мы ўжо ведалі, што прыйшоў загадчык кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, прафесар. доктар філалагічных навук Барыс Васільевіч Стральцоў — пачаў разбіраць летнюю практыку нашых таварышаў... Практыку, зразумела, разбіралі і раней — дзеля гэтага штогод збіраецца спецыяльная навуковая канферэнцыя. А вось такой прынцыповай, вострай размовы, зацікаўленай гутаркі з малодшымі калегамі аб месцы кожнага з нас, аб журналістыцы ў жыцці краіны, аб нашым станаўленні як будучых работнікаў «перадавой» ідэалагічнага фронта — не было.

Незвычайна энергічным быў для нас і стыль Б. В. Стральцова: ён не чытаў з лісткоў, не паўтараў зацёртае ці зачытае. Адчуваўся, што кожнае слова прайшло праз яго сэрца, розум. І толькі тады свае думкі ён прынёс у студэнцкую аўдыторыю. Да таго ж, ён жартаваў, нібыта з роўнымі. Калі бачыў, што нешта не зразумелі, растлумачваў падрабязна. Раўнадушных застацца не магло — гэты чалавек бачыць нас маладзейшымі аднадумцамі. паважае і ставіцца, як да сапраўдных калег.

Званок перарваў размову. Барыс Васільевіч здзівіўся: «Што, перапынак?» Самыя галасістыя. з тых. што не дадуць выкладчыкам прагаварыць перапынак,— маўчалі. Такой была першая сустрэча з гэтым чалавекам.

Ведаю. што пасля многія перагледзелі некаторыя свае ўстаноўкі на журналісцкую працу, на прынцыпы прафесійнага сталення.

Барыс Васільевіч Стральцоў — з пакалення падлеткаў вайны. У час змрочнай навалы фашыстаў яны ўжо не былі дзецьмі, але і да дарасласці было яшчэ далёка. Цяжкія гады вайны набліжалі гэтае далёка: пятнаццацігадовыя хлапчукі збіралі зброю — каб помсціць за сваіх бацькоў, родных, сяброў.

Чатыры бярозкі — трагічны сімвал для беларусаў — кожнага чацвёртага не стала ў вайну, кожную сям'ю, кожнага чалавека апалілі вогненным крылом жорсткія ваенныя гады. З чатырох сяброў у жывых застаўся адзін Б. В. Стральцоў.

Зусім нядаўна выйшла аповесць «Метраном памяці», якую Барыс Васільевіч прысвяціў тым, хто застаўся ў 41-м годзе. Цяпер друкуецца зборнік «Эфектыўнасць партыйнай публіцыстыкі» пад яго рэдакцыяй. Да XXX з'езда КПБ і XXVII з'езда КПСС прысвечаны маляўнічы альбом «Рытмы стварэння», які расказвае аб шматпланавым жыцці Беларусі — гэта таксама праца Барыса Васільевіча. На экранах краіны дэманструюцца дакументальныя стужкі «Старавойтаў адказвае СІ-ЭН-ЭН» і «Запрашае Беларусь», сцэнарый для якіх напісаў таксама ён. Вось экскізныя чатыры напрамкі палітры творчасці камуніста. Сам Барыс Васільевіч лічыць асноўнай дзейнасць журналіста — тэарэтыка і практыка. Гэтай галоўнай справе ён аддаў каля 40 гадоў жыцця.

Свой, абраны назаўсёды метраном жыцця, не дае расслабляцца, пасаваць перад цяжкасцямі, якіх хапае даволі. Ён працуе, як дазваляюць сіла, талент чалавека. І за сваіх загінуўшых сяброў таксама. Калі-нікалі ў аўдыторыі ўсміхнецца, маўляў, не мне ўжо быць на перадавой, змагацца супраць недахопаў публіцыстычным словам. А вам — маладым.

Так, жартуе. А сур'ёзна — прыедзе з камандзіроўкі з чарговага творчага семінара ці канферэнцыі і з абурэннем успамінае, што ледзьве не на кулачках патрэбна некаторым тэарэтыкам (ды і практыкам) журналістыкі растлумачваць, чым адрозніваюцца нарыс ад замалёўкі, карэспандэнцыя ад заметкі. І перад нашымі вачыма ўстае гэты важны семінар, і Барыс Васільевіч, які пераканаўча абгрунтаваў тэорыю жанраў публіцыстыкі і зараз адстойвае яе прынцыпы.

Нам прыемна і пачэсна быць вучнямі Барыса Васільевіча — камуніста-вучонага, педагога-байца, у якога акрамя афіцыйных тытулаў ёсць і нешта не меншае — любоў і павага да маладога пакалення. І як заканамернасць — любоў усіх, хто вучыўся і вучыцца ў яго Шчырасці і Публіцыстыцы.

А. СЦЯПАНАЎ,
студэнт факультэта журналістыкі.

БЯРЫ З КАМУНІСТАЎ ПРЫКЛАД!

Дзмітрый Орлік: «АДЧУВАЦЬ ПАДТРЫМКУ СЯБРОЎ»

Дзмітрый Орлік, студэнт V курса, сакратар камітэта камсамола хімічнага факультэта, член КПСС з 1985 года:

— З хіміяй было ўсё зразумела яшчэ ў школе. У нашай сям'і — гэта традыцыя. Для мяне хімія была найбольш цікавай навукай. Вось і выбраў хімфак.

Першы курс... Памятаецца восеньскі «бульбяны» дэсант. Старога, школьнага калектыву няма, а ў новы яшчэ не ўвайшоў — вось якая атрымалася сітуацыя. Выбралі мяне ў камсамольскае бюро групы. Па-праўдзе кажучы, не зусім адказна падышоў я да гэтага даручэння, за што і «прапясочылі» аднакурснікі на камсамольскім сходзе. Выправіўся!

На другім курсе выбралі мяне ў састаў факультэцкага камітэта камсамола. Нас было 23. Вядома, ганарыўся тым, што стаў адным з тых, каму давярае факультэт. Увесь час імкнуўся быць ў гушчыні падзей. Проста хацелася працаваць. Падабаецца ўвесь час быць патрэбным.

На IV курсе мне аказалі вялікі давер: выбралі сакратаром камітэта камсамола факультэта. Пачынаць працаваць сакратаром было цяжка. Мала ведаў людзей, агульнае становішча на факультэце. Раней неяк не думаў, ці ўсе члены камітэта знаходзяцца на сваім месцы. Дапамаглі мне парадамі былыя сакратары хімфака Сяргей Мікалаевіч Мальчанка, Дзмітрый Мычко, Уладзімір Белянкоў. Першая іх парада — навесці парадак у самім камітэце камсамола. Была прынцыповая размова. З некаторымі прыйшлося развітацца, але засталіся самыя надзейныя.

Год нам спатрэбіўся для навядзення парадку ў нашай «гаспадарцы». Значна актывізаваліся камсамольцы. Вечары, студэнцкі клуб, дні факультэта — шмат на хімфаку цікавага. Базавы напрамак дзейнасці камітэта — работа з групамі. Мы перагледзелі сістэму калектыўных даручэнняў. Цяпер яны сталі больш канкрэтнымі. Напрыклад, першы курс да 55-годдзя факультэта піша яго летапіс. Па дагавору мы супрацоўнічаем з факультэтам аўтаматызацыі кіравання МРТІ. Гэта супрацоўніцтва вылілася ў сумесныя вечары, конкурсы, экскурсіі.

З добрымі паказчыкамі падышла наша камсамольская арганізацыя да XXVII з'езда партыі. Правялі мітынг, прысвечаны яго адкрыццю. Вядзём «Дзённік з'езда».

Здаецца, V курс быў такі далёкі. І вось ён ужо заканчваецца. У пачатку навучальнага года мяне зноў выбралі сакратаром. 29 снежня 1985 года — дзень, калі мне ўручылі партыйны білет. Бадай, за ўсё жыццё, хай сабе і не такое вялікае, гэта быў самы хвалюючы і памятны дзень.

Я — шчаслівы чалавек. І лічу, што быць такім мне дапамаглі мае сябры. Нешта зроблена на факультэце — хваляць, звычайна, сакратара. Штосьці не так — зноў жа яму дастаецца. Але ж не адзін сакратар робіць і добрае, і благое. Я шчаслівы тым, што вакол мяне цудоўныя людзі. Гэта — кандыдат у члены КПСС Іра Лук'яненка, адказны за ваенна-патрыятычны сектар Саша Бумбліс, намеснік па інтэрнацыянальнай рабоце Алена Румянцава і многія, многія іншыя. Ім дзякую за падтрымку, за крытыку. Мне не страшна прымаць рашэнні. Я адчуваю падтрымку сяброў, аднадумцаў.

Запісала **С. ГОГАЛЬ.**
Фота **А. ВАЛОШЫНА.**

КУРСАМ ПАСКАРЭННЯ

АКТЫВІЗАВАЦЬ ДЗЕЙНАСЦЬ ВЫКЛАДЧЫКА

СЁННЯШНІЯ ўстаноўкі партыі абавязваюць усіх камуністаў быць ініцыятарамі ў той інтэнсіфікацыі працы, якая забяспечыць паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. З гэтага пункту гледжання кожны камуніст павінен разглядаць сваю працу і адпаведна працу таго калектыву, у якім ён займаецца творчай ці адміністрацыйнай дзейнасцю.

ХАЧУ СПЫНІЦЦА на трох асноўных момантах, якім надае вялікую ўвагу кіраўніцтва кафедры і партгрупа. А наша партгрупа — гэта практычна ўвесь калектыў: 18 камуністаў з 23 выкладчыкаў.

Першы клопат — прымяненне на практыцы адзіных крытэрыяў у вызначэнні работы кожнага. Пры абмеркаванні лекцый, семінарскіх заняткаў, якасці навуковых работ у нас не існуе так званага «табеля аб рангах». У аднолькавым становішчы знаходзяцца ўсе: ад выкладчыка да загадчыка кафедры.

Вялікую ролю ў паляпшэнні якасці працы адыгралі справаздачы камуністаў на партыйных сходах, дзелавы і прынцыповы аналіз дзейнасці выкладчыкаў на пасяджэннях кафедры.

Другім важным крокам, які быў накіраваны на інтэнсіфікацыю працы і павышэнне яе якасці, была нефармальная арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва. Па ініцыятыве камуністаў В. С. Сцёпіна і А. І. Зелянкова распрацавана новая методыка сацспаборніцтва. Зроблены акцэнт на якасных паказчыках з улікам спецыфікі выкладчыцкай працы нашай кафедры.

Укараненне новай методыкі сацыялістычнага спаборніцтва дазволіла кожнаму члену кафедры і калектыву ў цэлым не толькі ацаніць ужо зробленае, але і ўбачыць рэзервы для далейшага павышэння якасці. Адным з аспектаў з'яўлялася заахвочанне не толькі пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва, але і тых членаў калектыву, якія значна палепшылі свой працоўны ўдзел у параўнанні з папярэднімі гадамі. У выніку ўзнікаў стымул да інтэнсіфікацыі працы і ў тых, хто не ўваходзіў у лік пераможцаў, але сістэматычна паляпшаў свае вынікі. Кожны член калектыву спаборнічаў не толькі са сваімі калегамі, але і з самім сабой. Той факт, што калектыў за апошнія тры гады дасягнуў значных поспехаў, падкрэслівае дзейснасць новай сістэмы арганізацыі спаборніцтва.

Трэцім ключавым момантам у інтэнсіфікацыі нашай працы была паслядоўная рэалізацыя поўных патрабаванняў аб суадносінах вучэбна-выхаваўчых працэсаў і навукова даследчай дзейнасці выкладчыкаў. За апошні год у нас значна ўзраслі колькасць і якасць навуковых публікацый. Супрацоўнікамі кафедры выдана за два апошнія гады больш як 230 друкаваных аркушаў навуковай прадукцыі, у тым ліку 7 манаграфій.

Важную ролю ў актывізацыі даследаванняў адыграў метадалагічны семінар кафедры, на якім абмяркоўваліся актуальныя праблемы марксісцка-ленінскай навукі. Аб змястоўнасці работы гэтага семінара можна меркаваць па тым, што адна з праблем стала тэмай «круглага стала», што быў арганізаваны часопісам «Пытанні філасофіі» на базе кафедры.

Камуністы кафедры і ўвесь калектыў разумеюць, што ў сучасных умовах нельга спыняцца на дасягнутым. Перад намі стаіць задача рыхтаваць спецыялістаў заўтрашняга дня, у тым ліку і спецыялістаў самай высокай кваліфікацыі. За апошні час на кафедры абаронена 14 кандыдацкіх дысертацый.

Аднак мы сутыкнуліся з новай праблемай: узніклі цяжкасці ў размеркаванні аспірантаў, якія падрыхтавалі дысертацыі і нават своечасова абараніліся. Склалася супярэчлівая сітуацыя. З аднаго боку — ёсць установка рыхтаваць спецыялістаў высокай кваліфікацыі, адбіраць у аспірантуру лепшых студэнтаў, праводзіць конкурсы на мэтавыя месцы. А з другога — калі студэнт-выпускнік па конкурсу паступае ў аспірантуру і паспяхова яе заканчвае, узнікаюць цяжкасці з яго размеркаваннем. Сітуацыя гэта вядомая, яна існуе не першы год. Відаць, патрэбны радыкальныя змены ў планаванні падрыхтоўкі спецыялістаў і каплектаванні кафедраў. Толькі кафедра пытанні працаўладкавання аспірантаў і выпускнікоў самастойна вырашыць не можа.

Павышэнне эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу прадвызначае максімальную засяроджанасць на працы са студэнтамі, на выкананні прамых і галоўных абавязкаў выкладчыка. Паглядзім з гэтага пункту гледжання на дзейнасць выкладчыка. З году ў год павялічваюцца выдаткі яго часу на запаўненне рознага роду папер, напісанне даведак. Ствараецца ўражанне, што ўскладненне дынамікі сацыяльнага жыцця ўспрынята ўстановамі, якія закліканы арганізаваць працу выкладчыка, як неабходнасць прапарцыянальнага ўскладнення справаздачнасці.

Напрыклад, на працягу мінулага года кафедры рыхтавалі вучэбна-метадычны комплекс. Ніхто не падлічваў, колькі чалавек займалася яго складаннем. Але, ведаючы, што ён складаўся на кафедры, можна сказаць — шмат. Аднак што дае гэты комплекс для рэальнай дзейнасці? Спытаў хто-небудзь думкі выкладчыкаў?

Мы разумеем, што загады выконваюцца, а не абмяркоўваюцца. Але ж павінна быць нейкая зваротная сувязь. Не толькі з тых пазіцый, ці добра выконваюцца загады, а і з тых — наколькі прадуманыя гэтыя загады ці рэкамендацыі, якая рэальная карысць ад іх выканання. Арганізацыі, якія іх плануюць, павінны быць зацікаўлены ў якаснай дзейнасці выкладчыка не менш, чым ён сам. А для гэтага трэба зрабіць максімум, каб эканоміць час выкладчыкаў для яго заняткаў рэальнай справай. Рацыянальнае выкарыстанне рабочага часу адносіцца не толькі да сферы матэрыяльнай вытворчасці, але і да сферы духоўнай працы. І вызваленне выкладчыка ад выканання фармальных функцый можа выступіць у якасці рэзерву павышэння яго прафесійнага ўзроўню, якасці працы.

Практычнай аксіёмай з'яўляецца тое, што арганізацыя і планаванне нашай працы павінны мець сваёй мэтай канчатковы вынік — стварэнне такіх умоў, пры якіх палепшылася б якасць падрыхтоўкі спецыяліста. Усе арганізацыйныя мерапрыемствы не самамэта, а сродак для дасягнення гэтага выніку.

З гэтых пазіцый неабходна актывізаваць і выкананне грамадскіх даручэнняў выкладчыкамі, каб яны стымулявалі яго асноўны абавязак. Вырашыць гэта можна толькі тады, калі кожнае грамадскае даручэнне будзе ўзгоднена з партгрупай той альбо іншай кафедры, з яе кіраўніцтвам з улікам магчымасцей самога выкладчыка.

Л. КУЗНЯЦОВА.
парторг групы кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў.

НА МАРШЫ — КТМК

Пошуку — новыя формы

ІМКЛІВЫ час нараджае новыя словы. Але для дадзенага выпадку так сказаць было б не зусім дакладна. Таму што КТМК — толькі новая абрэвіятура, якая расшыфроўваецца вядомымі словамі — комплексны творчы маладзёжны калектыў. КТМК — гэта складаемы вектар маладосці, энергіі, ведаў, пошуку, які накіраваны ў заўтрашні дзень. КТМК — гэта той калектыў, дзе з найбольшай карысцю навука знайшла спалучэнне з тэхнікай, дзе чыстая тэорыя праз найкарацейшы шлях набывае пацверджанне на практыцы, неадкладна, сёння.

Зараз па краіне налічваецца каля 15 тысяч такіх калектываў. Мала гэта ці шмат? На жаль, не ўсе яны апраўдваюць сябе, тое прызначэнне, якое ім надаецца, не заўсёды каэфіцыент іх карыснага дзеяння большы затрачанага. У гэтай сувязі не будзе памылкі, калі сказаць, што КТМК, створаны на ФПМ, з'яўляецца адным з лепшых у нашай рэспубліцы і можа служыць добрым прыкладам астатнім.

Нарадзіўшыся ў 1985 годзе, ён хутка стаў рабіць свае першыя, але ўпэўненыя самастойныя крокі. Не прайшло і года, як... Але аб гэтым крыху пазней.

Пераважны ўзрост яго ўдзельнікаў — Аляксандра Каваленкі, Аляксандра Гопкі, Ларысы Дайнекі, Наталлі Шкут, Алега Канавалава, Уладзіміра Лабуды, Васіля Варнакова — 25 — 26 гадоў. Многія ўжо аспіранты ці навуковыя супрацоўнікі: спецыялісты, якія акрэслілі свае творчыя здольнасці. Некаторыя маюць спісы свайго ўкладу ў навуку, у паскарэнне НТП. Саюз маладых вучоных і спецыялістаў працуе пад кіраўніцтвам старшага навуковага супрацоўніка Ігара Палешчука і навуковага кансультанта — доктара тэхнічных навук Аляксандра Сяргеевіча Ключнікава.

...Не прайшло і года, а за выдатную працу і ўкараненне тэмы «Распрацоўка метадаў і сродкаў аўтаматызацыі працэсу праектавання электрадынамічных сістэм» КТМК кафедры інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцей заслужана вылучаны на саісканне прэміі Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне навукі і тэхнікі 1986 года.

А. ВІХРОВА.

ПЕРАМОЖЦЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА Ў ГОНАР XXVII З'ЕЗДА КПСС

ПЛАНЫ ПАРТЫІ — ПЛАНЫ НАРОДА!

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ КАЛЕКТЫВУ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА НА 1986 ГОД

Удзельнічаючы ў 1986 годзе ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве, калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна ў першы год дванаццатай пяцігодкі прымае наступныя сацыялістычныя абавязацельствы:

1. Выканаць планы прыёму і выпуску спецыялістаў па дзённай, вячэрняй і завочнай формах навучання і па аспірантуры.

2. Абараніць 5 доктарскіх і не менш 80 кандыдацкіх дысертацый.

3. Падрыхтаваць да выдання і надрукаваць не менш чым 18 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў і 220 метадычных распрацовак.

4. Дамагчыся, каб колькасць дыпломных работ студэнтаў дзённай формы навучання, якія рэкамендаваны да ўкаранення і друку, склала не менш 33 працэнтаў.

5. Выканаць НДР на агульную суму не менш 12,7 мільёна рублёў. Атрымаць эканамічны эфект ад укаранення НДР не менш чым 20 мільёнаў рублёў.

6. Арганізаваць і правесці 3 рэспубліканскія і 24 універсітэцкія навуковыя і навукова-метадычныя канферэнцыі.

7. Працягваць распрацоўку навуковых тэм, якія звязаны з рэалізацыяй Харчовай праграмы СССР. Для аказання непасрэднай дапамогі сельскай гаспадарцы рэспублікі накіраваць на сельскагаспадарчыя работы не менш 3000 студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў і адпрацаваць у калгасах і саўгасах не менш тысяч чалавека-дзён, у тым ліку ў падшэфным саўгасе «Гарадок» Уздзенскага раёна.

8. Прадставіць у Дзяржкамітэт па адкрыццях і вынаходніцтвах не менш за 325 заявак і атрымаць на раней пададзеныя заяўкі не менш 200 станоўчых рашэнняў.

9. Прадставіць на Усесаюзны і Рэспубліканскі конкурсы не менш 280 студэнцкіх работ.

10. Падрыхтаваць да друку не менш 290 артыкулаў у сааўтарстве са студэнтамі.

11. Падрыхтаваць не менш 3300 дакладаў студэнтаў на навуковых канферэнцыях.

12. Забяспечыць падрыхтоўку на ФПК не менш 1800 студэнтаў.

13. Сфарміраваць зводны студэнцкі будаўнічы атрад колькасцю не менш 2000 чалавек. Асвоіць сіламі зводнага студэнцкага атрада не менш 2,8 мільёна рублёў капіталаўкладанняў.

14. Арганізаваць і правесці 27 паходаў моладзі, выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа з удзелам у іх не менш 300 чалавек.

15. Прачытаць для насельніцтва 6000 лекцый на грамадска-палітычныя і навуковыя тэмы.

16. Падрыхтаваць 5 майстроў спорту, 25 кандыдатаў у майстры спорту, не менш 90 спартсменаў I разраду і не менш 5000 спартсменаў масавых разрадаў.

17. Падрыхтаваць не менш 2300 значкістаў комплексу ГПА.

18. Выканаць наменклатурныя мерапрыемствы па ахове працы на суму 40 тысяч рублёў.

19. Прарабіць на сэканомленай электраэнергіі тры дні.

20. Выканаць падрыхтоўчыя работы і адкрыць піянерскі лагер для адпачынку ў летні перыяд 300 дзяцей супрацоўнікаў.

Сацыялістычныя абавязацельствы прыняты на канферэнцыі працоўнага калектыву Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна 13 лютага 1986 года.

МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

Дзімітр Дзімітраў: «Я НЕ РАЗВІТВАЮСЯ»

Падарожжа ў Краіну Саветаў для Дзімітра Дзімітрава з балгарскага горада Габрава пачалося яшчэ ў пятым класе. Дапамог яму падручнік рускай мовы. Тут было шмат вядомага — літары, сэнс некаторых слоў. Не думаў хлопчык, што падарожжа ў братнюю краіну адбудзецца ў сапраўднасці і працягнецца доўгія і адначасова хуткія чатыры гады.

А ДАГЭТУЛЬ была школа, напружаная вучоба ў машынаэлектратэхнічным інстытуце. Надышоў час самастойнай працы інжынерам, начальнікам цэха на заводзе ў родным горадзе. Некантакты. Усё гэта стала магчымым на нашай кафедры.

Што хачу заўважыць — напружаная навуковая работа праходзіла ў атмасферы добразычлівасці. Узаемаразуменне дазабыўная падзея — уступленне ў рады БКП. Яшчэ адна радасная падзея — накіраванне разам з жонкай Дорай на вучобу ў аспірантуру ў СССР.

Дзімітр за гэтыя гады атрымаў 5 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы, выступаў на канферэнцыях і семінарах, надрукаваў 5 навуковых работ. А нядаўна яны з Дорай абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Прыйшла пара развітвацца з Мінскам. Дора на днях паехала на радзіму. Яна — дэпутат Народнага сходу НРБ. Спраў у яе там ужо накапілася. Хутка ад'язджаць Дзімітру. Што запомнілася яму за гады жыцця ў СССР?

Малады вучоны адказаў:

— Пачуцці мае цяжка выказаць. Гэта і хваляванне расставання з братняй краінай, і радасць сустрэчы з радзімай, і жаданне хутчэй выкарыстаць свае веды і вопыт. Пачуцці такія ж неабсяжныя, як і ваша краіна, такія ж глыбокія і змястоўныя, як душэўная шчодрасць мноства маіх знаёмых і сяброў. У гэтых якасцях савецкіх грамадзян я пераконваўся вельмі часта.

Узяць, напрыклад, вучобу і навуковую работу на кафедры кібернетыкі факультэта радыёфізікі і электронікі. Тэма маёй дысертацыі даволі складаная: рабатызацыя вытворчых працэсаў, аўтаматызацыя інжынернай працы. А гэта, як вы разумееце, эксперыменты, даследаванні, абмеркаванне дасягнутага, навуковыя сягалася даволі хутка. Дастаткова было некалькіх шчырых слоў, нават калі былі заўвагі, указанні на памылку. Усё гэта разам дапамагала мне крочыць наперад, пераадольваць перашкоды і цяжкасці. Да глыбіні душы пакарыў мяне навуковы кіраўнік А. С. Мівадзіць паралелі з Балгарыяй. Шчыры, непадробны інтарэс праяўляе ён да пасцярэння навукова-тэхнічнага прагрэсу. Новая рэдакцыя Праграмы і дапаўненні ў Статуце КПСС таксама ў полі яго зроку. З нецярплівасцю чакае рашэнняў XXVII з'езда КПСС. Ды і ці можа быць інакш?! Дзімітр больш трох гадоў узначальваў партыйную арганізацыю балгарскіх навучэнцаў у Мінску. Гэта адказнасць і гонар. Гэта пошук новага ў рабоце і планаванне дзейнасці, строгае патрабаванне добра вучыцца, авалодваць дасягненнямі савецкай навукі і тэхнікі ўсімі студэнтамі і аспірантамі з Балгарыі.

Характарыстыку камуніста дапаўняе дэкан па рабоце з замежнымі навучэнцамі універсітэта дацэнт Л. М. Аўсянка:

— З ім лёгка размаўляць. І не толькі таму, што рускую мову ён ведае як сваю. Працаздольны, шчыры, мэтанакіраваны чалавек.

...Дзімітр у гэтыя апошнія дні адчувае сум, але ёсць у яго і надзея, што ён зноў прыедзе ў Савецкі Саюз. «Можа гэта будзе камандзіроўка па навуковай рабоце,— гаворыць ён,— альбо вытворчая неабходнасць. Альбо



халёў, доктар тэхнічных навук, загадчык кафедры. У яго было чаму навучыцца: настойлівасці, прынцыповасці, імкненню да новага. І што асабліва падкупляе ў яго характары — давер'е да маладых спецыялістаў. Такога веру я не мог не апраўдаць...

У гутарцы адчувалася, як Дзімітр добра арыентуецца ў жыцці нашай краіны, умее прагурысцкая паездка. Не так гэта важна. Я ўпэўнены, што прыеду зноў! Вось толькі сына Стэфана навучу рускай мове і абавязкова прыеду. Адным словам, я не развітваюся...»

А. БЕЛАВУС,
студэнт факультэта журналістыкі.

НА ЗДЫМКУ: Дзімітр Дзімітраў у час абароны дысертацыі.

З НАШАЙ ПОШТЫ

Відэакасеты на пракат

УСЁ БОЛЬШ УПЭЎНЕНА ў наш быт уваходзяць відэамагнітафоны. Не ўсе ведаюць, што да паслуг уладальнікаў відэаабсталявання па вуліцы Інтэрнацыянальнай, 20, працуе відэатэка— пункт пракату відэакасет. Супрацоўнікі відэатэкі прапануюць на ваш густ відэазапісы лепшых савецкіх і замежных фільмаў, тэлепраграм. Відэапраграму, якая вам спадабаецца, вы зможаце паглядзець дома некалькі разоў.

Аб новых паступленнях можна даведацца па тэлефону 23-77-66.

Т. МІРОНАВА,
загадчыца відэатэкі.

КЛУБ ЦІКАВЫХ СУСТРЭЧ

І. П. Шамякін: «ПРАЦАВАЦЬ З ДУШЭЎНАЙ ПАСКОРАНАСЦЮ»

Іван Пятровіч Шамякін — народны пісьменнік Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і літаратурнай прэміі імя Я. Коласа, Герой Сацыялістычнай Працы, дэлегат XXX з'езда Кампартыі Беларусі — завітаў на сустрэчу да навуковых супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта. Адбылася змястоўная гутарка, якую запісаў студэнт факультэта журналістыкі А. Дзядок.

— Іван Пятровіч, дзе Вы знаходзіце сюжэты для сваёй творчасці?

— Вытокамі сюжэтаў маіх твораў з'яўляецца сучаснае жыццё, спрадвечная барацьба паміж духоўнасцю і бездухоўнасцю, смеласцю і баязлівасцю, шчырасцю і двудушшам, сумленнасцю і маральнай нявытрыманасцю. Цікавыя сюжэты з'яўляюцца, калі чытаеш гістарычныя дакументы, перапіску. Гэта надзвычай карысны занятак.

— Што Вас задавальняе і што не задавальняе ў сучаснай беларускай літаратуры?

— Наша літаратура з часоў Коласа і Купалы, несумненна, выраслa ў плане ідэі і мастацкага слова. П'есы А. Дударава, аповесці А. Адамовіча, шматлікія творы В. Быкава зараз папулярныя не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. І ўсе ж ёсць яшчэ шэраг сур'ёзных недахопаў. Хацелася б бачыць менш шэрых, невыразных у мастацкіх адносінах кніг. Не ў поўнай меры асэнсоўваецца літаратурай тэма маралі, мала публіцыстычных твораў на злобу дня. Нам патрэбна ўзмацніць грамадзянскую пазіцыю літаратуры ў барацьбе з рознымі хапугамі, дзялкамі, дармаедамі.

— Іван Пятровіч, над чым працуеце цяпер? Вашы творчыя планы?

— Працую над раманам аб вайне, пачатковая назва якога «Зеніт». Старонкі твора раскажуць чытачам аб падзеях, сведкам якіх быў сам. Дзеянні адбываюцца на Крайняй Поўначы, дзе мне давялося служыць у гады вайны. У наша зенітнае падраздзяленне прывезлі маладых дзяўчат, якіх патрэбна было вывучыць ваеннай справе. Аб нялёгкім ваенным лёсе, аб невычэрпнай крыніцы мужнасці савецкага чалавека — гэты твор. Пасля заканчэння рамана хачу звярнуцца да гістарычнай тэмы. Ёсць задумка напісаць гістарычны ўспамін аб сваёй радаслоўнай. Наогул, мы вельмі нядбайна адносімся да яе. Часам зусім не ведаем, кім былі нашы продкі. Дзе яны жылі, чым займаліся. А гэта — надзвычай цікава. Збіраюся таксама напісаць кнігу мемуараў аб жыцці і дзейнасці відных палітычных і літаратурных дзеячаў нашай краіны. Новая кніга раскажа чытачам аб найбольш цікавых момантах жыцця П. Броўкі, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Шолахава, П. Глебкі.

— Вашы адносіны да сучаснай моладзі?

— У параўнанні з моладдзю майго пакалення сёння юнакі і дзяўчаты больш адукаваныя, больш патрабавальныя да ўмоў жыцця. Адметнай рысай сучаснай моладзі з'яўляецца, бадай, яе сацыяльная і грамадзянская актыўнасць, ініцыятыўнасць, смеласць і прынцыповасць у рашэнні надзённых пытанняў жыцця. Разам з тым, выклікае заклапочанасць той факт, што некаторыя юнакі і дзяўчаты захапляюцца не самым лепшым, не маюць правільнага ўяўлення аб сапраўдных каштоўнасцях нашага жыцця. Моладзь трэба выхоўваць. І нам, пісьменнікам, у першую чаргу.

На развітанне пісьменнік пакінуў аўтограф чытачам газеты «Беларускі універсітэт»:



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

27 лютага 1986 г.
Зак. 222. АТ 07114

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ.